УДК 811.161.3’373

# ФОНЕТИЧЕСКАЯ АДАПТАЦИЯ ГЕРМАНИЗМОВ В БЕЛОРУССКИХ ФОЛЬКЛОРНО-ДИАЛЕКТНЫХ ЗАПИСЯХ XIX в.

**В. В. ПАХИРКО**[1)]

[1)]Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь

Исследуются германизмы в белорусских фольклорно-диалектных записях XIX в. Анализируются особенности их фонетической адаптации в белорусском языке в системах вокализма (аканье, яканье, переход звуков [о] и [а] в звуки [ы] и [у]) и консонантизма (передача немецкого звука [ф] через звуки [п], [ф], [хв]; переход немецкого [х] в звуки [к] или [г]; передача немецкого [р] затвердевшим белорусским [р]; употребление мягкого [л’] на месте немецкого [л]; диссимиляция; озвончение начального звука [х] до [г]). При сопоставлении германизмов, которые закрепились в старобелорусском языке, с соответствующими единицами в фольклорно-диалектных записях XIX ст. отмечена фонетическая вариантность слов (как в разные промежутки времени, так и в пределах одного периода), что объясняется прежде всего продолжением фонетической адаптации и народным характером анализируемого материала.

***Ключевые слова:*** фольклорно-диалектные записи; фонетическая адаптация; система вокализма; система консонантизма; ассимиляция; диссимиляция.

# ФАНЕТЫЧНАЯ АДАПТАЦЫЯ ГЕРМАНІЗМАЎ У БЕЛАРУСКІХ ФАЛЬКЛОРНА-ДЫЯЛЕКТНЫХ ЗАПІСАХ XIX ст.

**В. У. ПАХІРКА**[1*]

[1*]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь

Даследуюцца германізмы ў беларускіх фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. Аналізуюцца асаблівасці іх фанетычнай адаптацыі ў беларускай мове ў сістэмах вакалізму (аканне, яканне, пераход гукаў [о] і [а] у гукі [ы] і [у]) і кансанантызму (перадача нямецкага гука [ф] праз гукі [п], [ф], [хв]; пераход нямецкага [х] у гукі [к] ці [г]; перадача нямецкага гука [р] беларускім зацвярдзелым [р]; ужыванне мяккага [л’] на месцы нямецкага [л]; дысіміляцыя; азванчэнне пачатковага гука [х] да [г]). Пры супастаўленні германізмаў, якія замацаваліся ў старабеларускай мове, з адпаведнымі адзінкамі ў фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. выяўлена фанетычная варыянтнасць слоў як на розных адрэзках часу, так і ў межах аднаго перыяду, што тлумачыцца перш за ўсё працягам фанетычнай адаптацыі германізмаў і народным характарам аналізуемага матэрыялу.

***Ключавыя словы:*** фальклорна-дыялектныя запісы; фанетычная адаптацыя; сістэма вакалізму; сістэма кансанантызму; асіміляцыя; дысіміляцыя.

**Образец цитирования:**
Пахірка ВУ. Фанетычная адаптацыя германізмаў у беларускіх фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія*. 2018;3:83–91.

**For citation:**
Pakhirka VU. Phonetic adaptation of germanisms in XIX century Belarusian folklore and dialect records. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2018;3:83–91. Belarusian.

**Автор:**
***Вероника Владимировна Пахирко*** – аспирантка кафедры истории белорусского языка филологического факультета. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор Н. Г. Пригодич.

**Author:**
***Veranika U. Pakhirka***, postgraduate student at the department of the history of the Belarusian language, faculty of philology.
*veronicapachirko@gmail.com*

# PHONETIC ADAPTATION OF GERMANISMS IN XIX CENTURY BELARUSIAN FOLKLORE AND DIALECT RECORDS

***V. U. PAKHIRKA***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article considers germanisms in XIX century Belarusian folklore and dialect records. It contains an analysis of the peculiarities of their phonetic adaptation in the Belarusian language according to its vowel-system (akanje, yakanje, transition of sounds [o] and [a] into sounds [y] and [u]) and consonant-system (transition of the sound [f] into sounds [p], [f], [hv]; transition of sounds combination [ch] into sound [k] or [g]; hard [r]; soft [l']; dissimilation; vocalization of the sound [h] to the sound [g]). When comparing germanisms in Old Belarusian and in XIX century folklore and dialect records, phonetic variability among word forms in different time intervals, as well as differences within the same period are observed which is largely attributed to further phonetic adaptation and folk nature of the analuzed material.

***Key words:*** folklore and dialect records; phonetic adaptation; vowel system; consonant-system; assimilation; dissimilation.

## Уводзіны

Другая палова XIX – пачатак XX ст. традыцыйна лічыцца перыядам станаўлення сучаснай (новай) беларускай літаратурнай мовы, паступовай выпрацоўкі і замацавання на практыцы яе графіка-арфаграфічных, марфалагічных і лексічных норм. На гэтым этапе яшчэ шырока прадстаўлена варыянтнасць форм, прычым не толькі ў літаратурна-пісьмовай разнавіднасці мовы, але і ў вусных гаворках, зафіксаваных у фальклорна-дыялектных запісах таго часу. Крыніцамі фактычнага матэрыялу для гэтага даследавання сталі зборнікі фальклорна-дыялектных запісаў Д. Г. Булгакоўскага, П. А. Бяссонава, М. В. Доўнар-Запольскага, І. І. Насовіча, Е. Р. Раманава, П. В. Шэйна.

## Матэрыялы і метады даследавання

Зборнік П. А. Бяссонава «Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта» (далей – БПБ) выйшаў у 1871 г. У прадмове ўкладальнік падкрэсліваў: «Для нас теперь главное, и всегда, но теперь единственно главное, почти исключительно привлекающее весь интерес, – само произведение белорусского песнотворчества»[1] (тут і далей цытаты прыводзяцца ў адпаведнасці з нормамі сучаснай рускай мовы. – *В. П.*).

Аўтарству І. І. Насовіча належаць многія працы, прысвечаныя беларускаму фальклору. Навуковец быў адным з першых, хто, збіраючы мясцовы фальклорны матэрыял, заўважыў беларускую нацыянальную самабытнасць, адметныя рысы народнай творчасці, яе пераважна вусны характар. Мы прааналізавалі два зборнікі І. І. Насовіча: «Белорусские песни» 1873 г. (далей – БП) і «Сборник белорусских пословиц» 1874 г. (далей – СБП)[2].

У зборніку П. В. Шэйна «Белорусские народные песни, с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями» (далей – БНПШ), апублікаваным у 1874 г., прыводзяцца некаторыя агульныя заўвагі наконт характару беларускіх песень, пералічваюцца фанетычныя асаблівасці вымаўлення і марфалагічныя рысы «белорусского наречия»[3].

Яшчэ адной крыніцай фальклорна-дыялектнага матэрыялу сталі першыя два выпускі «Белорусского сборника» Е. Р. Раманава (далей – БСР), апублікаваныя ў 1886 г. Аўтар зрабіў агляд некаторых тагачасных падобных выданняў і падкрэсліў неабходнасць хуткага агульнага цэнтралізаванага збору фальклорнага матэрыялу, патлумачыўшы гэта тым, што некаторыя жанры на той час пачалі знікаць: «Полагаем, что необходимо прежде собрать материалы во всех пяти белорусских губерниях и составить их общий свод… Но надо спешить. Сказки уже исчезают»[4].

Зборнік Д. Г. Булгакоўскага «Пинчуки. Этнографический очерк. Песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверия и местный словарь» (далей – ПЭС) быў выдадзены

[1]*Бессонов П. А.* Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта. М. : Тип. Бахметева, 1871. № 1. С. LVIII.

[2]*Носович И. И.* Белорусские песни. СПб. : Тип. Майкова, 1873 ; *Носович И. И.* Сборник белорусских пословиц. СПб. : Тип. Имп. Акад. наук, 1874.

[3]*Шейн П. В.* Белорусские народные песни, с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями, с приложением объяснительного словаря и грамматических примечаний. СПб. : Тип. Майкова, 1874.

[4]*Романов Е. Р.* Белорусский сборник. Т. 1, вып. 1–2. Киев : Тип. С. В. Кульженко, 1886. С. V–VI.

ў 1890 г. Аўтар звяртаў увагу на своеасаблівасць фальклору пінчукоў: «Нынешний живой говор пинчуков и памятники словесного творчества их старины свидетельствуют о том, что они далеко не в такой степени подпали влиянию чуждых элементов, как другие жители Минской губернии и вообще Северо-Западнаго края. <…> В языке заметен переход наречия малороссийского в белорусское, и оттого часто преобладает в нем то тот, то другой элемент»[5].

Зборнік этнаграфічных матэрыялаў М. В. Доўнар-Запольскага «Песни пинчуков» (далей – ППДЗ) быў апублікаваны ў 1895 г. Аўтар разам з фальклорным матэрыялам ахарактарызаваў фанетычныя і марфалагічныя рысы гаворкі пінчукоў. Мэтай этнографа было запісаць матэрыял, які ў максімальнай ступені адлюстроўваў бы асаблівасці гаворак нават суседніх вёсак. Зразумела, геаграфічны арэал вывучаемага матэрыялу ахоплівае найперш Піншчыну, сам аўтар адзначаў: «Предлагаемый сборник пинских песен составляет сравнительно небольшую часть этнографического материала, собранного мною во время летних поездок в Белоруссию в 1890 (в Пинский, Мозырский и Речицкий уу.) и 1892 году (Бобруйский, Игуменский и Минский уу.)»[6].

Колькасныя паказчыкі германізмаў у прааналізаваных тэкстах адлюстраваны ў табліцы.

**Колькасць германізмаў у фальклорна-дыялектных зборніках**

**The number of Germanisms in folklore and dialect records**

| № | Умоўная назва крыніцы і год выдання | Агульная колькасць фальклорных адзінак | Колькасць фальклорных адзінак з германізмамі | Колькасць германізмаў |
|---|---|---|---|---|
| 1 | БНПШ, 1874 | 870 | 319 | 106 |
| 2 | БПБ, 1871 | 181 | 58 | 57 |
| 3 | ППДЗ, 1895 | 601 | 188 | 69 |
| 4 | ПЭС, 1890 | 532 | 133 | 59 |
| 5 | БСР, 1886 | 1657 | 409 | 115 |
| 6 | БП, 1873 | 437 | 101 | 74 |
| 7 | СБП, 1874 | 3823 | 282 | 87 |

Адаптацыя іншамоўных слоў у мове, якая іх запазычвае, праходзіць у некалькі этапаў. Перш за ўсё гэта фармальная адаптацыя, якая адбываецца ў выніку графічнага, фанетычнага і марфалагічнага прыстасавання слова да норм мовы-рэцыпіента. Адметнасць працэсу адаптацыі запазычанняў у народна-дыялектнай мове ў параўнанні з засваеннем іншамоўнай лексікі літаратурнай мовай заключаецца ў больш поўнай асіміляцыі, імкненні максімальна наблізіцца да фанетыка-граматычнай і лексіка-семантычнай сістэм пэўнай гаворкі, у выніку чаго назіраецца пастаяннае вар'іраванне знешняй формы слоў і іх значэнняў [1, с. 153].

Нягледзячы на тое, што ў акрэслены перыяд графічнае і фанетычнае афармленне фальклорных матэрыялаў часта залежала ад светапогляду этнографа, а таксама ад пануючай ідэалогіі і мэт, пастаўленых кіраўніцтвам перад збіральнікам, усё ж можна вылучыць і асобныя агульныя рысы спосабаў перадачы германізмаў у беларускіх фальклорна-дыялектных зборніках XIX ст.

## Вынікі і абмеркаванне

Фанетычная адаптацыя запазычанняў – гэта найперш замена нехарактэрных для беларускай мовы гукаў і спалучэнняў уласцівымі ёй фанетычнымі адзінкамі. У народных гаворках гэты працэс больш паслядоўны, хоць і характарызуецца шматварыянтнасцю і неўнармаванасцю [2, с. 27].

Паколькі фанетычныя змены ў дыялектных запазычаннях адлюстроўваюць іх прыстасаванне да гукавой сістэмы пэўнай гаворкі, то нярэдка адна і тая ж лексема ў розных рэгіёнах адаптавалася па-рознаму [1, с. 151]. Гэта выразна заўважаецца пры супастаўленні падобных песень са зборнікаў розных аўтараў.

Працэс запазычвання германізмаў беларускай мовай меў апасродкаваны характар, большасць слоў нямецкага паходжання трапляла ў беларускую мову праз пасрэдніцтва польскай мовы. У сувязі з гэтым пры аналізе фанетычнай адаптацыі германізмаў у беларускіх фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. трэба звяртаць увагу і на формы такіх слоў у польскай мове.

[5] *Булгаковский Д. Т.* Пинчуки. Этнографический сборник. Песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь. СПб. : Тип. В. Безобразова и К°, 1890. С. V–VI.

[6] *Довнар-Запольский М. В.* Белорусское Полесье. Сборник этнографических материалов, собранных М. Довнаром-Запольским. Песни пинчуков. Киев : Тип. Имп. ун-та св. Владимира В. И. Завадского, 1895.

**Фанетычная адаптацыя галосных.** У ранніх помніках старажытнага беларускага пісьменства заўважаецца тэндэнцыя выпрацоўкі своеасаблівых узораў графіка-арфаграфічнага афармлення іншамоўнай лексікі з улікам вусна-гутарковых асаблівасцей мясцовых гаворак [3, с. 77]. Гэта тэндэнцыя працягвалася і ў XIX ст., калі аўтары зборнікаў намагаліся перадаць фанетычныя асаблівасці народнай мовы на пісьме.

Найбольш распаўсюджанымі відамі фанетычнай адаптацыі ў сістэме галосных гукаў у фальклорных матэрыялах XIX – пачатку XX ст. з’яўляюцца аканне і яканне, а таксама пераход гукаў [о] і [а] у гукі [ы] і [у]. Разгледзім некаторыя прыклады гэтых фанетычных працэсаў.

1. Аканне. ***А**надарак* (пол. ***i**nderarak* < ням. ***U**nterrock*); у старабеларускіх тэкстах гэты германізм сустракаецца ў формах ***и**ндеракъ*[7] (1569), ***и**нъдоракъ* (1593). У фальклорных матэрыялах XIX ст. ён ужо адлюстроўваў характэрнае для беларускай мовы аканне: ***а**ндаракъ*, ***а**ндарачищами*, ***а**ндараки*, *въ* ***а**ндарачку* (*Пропивъ жонкинъ* ***андаракъ****, / Ходзиць милый, якъ дуракъ* (БП, с. 259)).

*Буд**а**ваць* (пол. *bud**o**wać* < ням. *b**ū**den*); старабеларускія формы: *боуд**о**вал* (XV ст.), *буд**о**вати* (1529, 1568), *буд**о**вать* (1580), *буд**у**вать* (1667), *буд**о**валъ* (1690). У тэкстах XIX ст. назіраем пераход да сучаснай формы: *побуд**а**ваны* (*Хорошо на дворѣ* ***побудаваны*** *свирны, / Гонтами побиваны, соболями покрываны* (БП, с. 97)).

*В**а**ндраваць* (пол. *w**ę**drować* < ням. *w**a**ndern*); старабеларускія формы: *в**е**ндроват* (XVII ст.), *в**е**нъдровати* (XVII ст.), *в**е**ндровали* (1692). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. пераважаюць формы, у якіх перадаецца аканне: *в**а**ндровати*, *м**а**ндровати*, *м**а**ндруваты*, *м**а**ндроваты*, *м**а**ндруючы*, *обв**а**ндруець*, *пом**а**ндрую*, *пом**а**ндрувала*, *м**а**ндрує*; аднак ужывалася і форма *повендрую* (*А не хочешь даровати, / Ходи зъ нами* ***вандровати*** (БПБ, с. 16)).

*Ган**а**к* (пол. *gan**e**k* < сяр.-в.-ням. *ganc*); старабеларускія формы: *кган**о**къ* (1556, 1571, 1580, 1595; XVII ст.), *ган**о**къ* (1629, 1653), *кган**е**къ* (1682). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. адзначаецца варыянтнасць: побач з формамі *гон**а**чекъ*, *на ган**а**чку* сустракаюцца напісанні *ган**о**къ*, *ган**о**чекъ*, *кы ган**о**чку*, *по ган**о**чкахъ*, *ган**ы**чакъ*, *на ган**ы**чку*, *на ган**ы**къ* (*Адзинъ панычъ кралевичъ да / На новумъ* ***ганачку*** *пахаджаючи* (ППДЗ, с. 106)).

*Г**а**плік* (ст.-пол. *h**e**ftlik* < ням. *H**e**ftel*); старабеларускія формы: *г**а**плики* (1516–1519), *г**а**пликовъ* (1583, 1691, 1699). У запісах XIX ст. аканне таксама перадавалася: *г**а**плычки* (*Куплю жъ я ей черевычки –* ***гаплычки****, / Еще къ тому черевычки на ручки* (ППДЗ, с. 30)).

*Ж**а**брак* (пол. *ż**e**brak* < ням. *s**e**ffr*); старабеларускія формы: *ж**е**брючи* (XV ст.), *ж**е**браки* (канец XV ст.; 1568, 1596, 1616, 1647), *ж**е**бручи* (1568), *ж**е**бруючи* (каля 1580 г.), *ж**е**бровать* (1597), *ж**е**бракъ* (1627, 1653), *ж**а**браков* (пачатак XVII ст.), *ж**е**брал* (пачатак XVII ст.), *ж**е**брити* (1603), *ж**е**брати* (1635, 1638–1648). У фальклорных матэрыялах XIX ст. сустракаюцца напісанні *ж**а**бруець*, *ж**а**бруючи*, а таксама *ж**е**бруючы*, *ж**е**бруючи*, *ж**е**брования*, *ж**у**броваць*, *наж**у**бруюся*, *ж**ы**броваць* (*Ци яно горуець, ци яно* ***жабруець****, ци коня не маець, ци дорожки не знаець?* (БСР, с. 387)).

*Ж**а**ўнер* (ст.-пол. *ż**o**łdnierz* < ням. *S**ö**ldner*); старабеларускія формы: *ж**о**лнерми* (канец XV ст.), *ж**о**лнеровъ* (1507, 1615), *ж**е**лнерми* (1516–1519), *ж**о**лнеръми* (1539), *ж**о**лнеры* (каля 1580, 1597), *ж**о**лнэре* (пачатак XVII ст.), *з**о**внеров* (пачатак XVII ст.), *з**о**лнѣръ* (пачатак XVII ст.), *ж**о**лънере* (сярэдзіна XVII ст.), *ж**о**рнери* (другая палова XVII ст.), *ж**о**лнѣръ* (1653), *ж**о**внеру* (1711). У тэкстах XIX ст. адзначаецца варыянтнасць у напісанні гэтага слова: *ж**а**ўнеръ* і *ж**о**ўнеръ*, *ж**о**внеръ*, *ж**о**ўнеры*, *ж**у**вняры*, *ж**о**внеры*, *ж**о**внерки*, *ж**о**ўнерамъ*, *ж**о**внерамъ*, *ж**у**внярью*, *ж**у**вняровъ*, *ж**о**внерика*, *ж**о**ўнира* (*Ў недзѣлю порана /* ***Жаўнеръ*** *дзѣўчыну намовя* (ППДЗ, с. 153));

*Рын**а**к* (пол. *ryn**e**k* < сяр.-в.-ням. *rinc*); старабеларускія формы: *на рын**о**къ* (1588, 1593). У фальклорных запісах XIX ст. зафіксаваны наступныя варыянты напісання: *на рын**а**чку* і *рын**о**къ*, *рын**ы**къ*, *рын**о**чекъ*, *рын**о**чакъ*, *серодъ рын**о**чку*, *на рын**о**чку*, *рын**ы**чикъ* (*Ой ў Слуцку на* ***рыначку*** *пашла навина: / Наша панна вайтоўночка сына радзила* (ППДЗ, с. 106)).

*Ш**а**наваць* (ст.-пол. *sz**o**nować* < сяр.-в.-ням. *sch**ô**nen*); старабеларуская форма: *ш**а**новати* (1544). Аканне ў гэтым слове паслядоўна перадавалася і ў фальклорных матэрыялах XIX ст.: *ш**а**новаць*, *ш**а**нуваць*, *ш**а**новаци*, *ш**а**новати*, *ш**а**новаты*, *ш**а**нуицца*, *ш**а**нуй*, *ш**а**новала*, *ш**а**нуешъ*, *ш**а**ную*, *ш**а**нуешься*, *ш**а**нуюць*, *ш**а**нуючи* (*Ци будзиць яна / Нашу матухну* ***шановаць*** (БНПШ, с. 331)).

2. Яканне. *Мал**я**ваць* (ст.-пол. *mal**o**wać* < ст.-в.-ням. *m**â**l**ô**n*); старабеларускія формы: *мал**е**вати* (XV ст.; 1566), *мал**е**вали* (пачатак XVII ст., сярэдзіна XVII ст.), *мал**о**вати* (1618), *мал**е**ват* (сярэдзіна XVII ст.), *мал**іо**валъ* (1722). У фальклорных тэкстах XIX ст. яканне перадаецца непаслядоўна: *мал**я**ванные*, *мул**я**ваная*, *мул**я**ровъ*, *змул**я**вавши* і *мал**е**ваные*, *мул**е**ваная*, *мал**е**вали*, *мул**е**ваные*, *мал**е**ваная*, *мал**е**ваную*, *мал**е**ваненькимъ*, *мал**е**ванъ*, *мал**е**ваненькей*, *мул**е**ваняньк**і**й*, *мал**е**ванаго*, *мал**ё**ваными*, *мал**ё**ваны*, *мал**ё**ваную*, *вымал**ё**вала*, *мул**ё**ване*, *мал**ё**ваны*, *мыл**и**ваниньк**і**й*, *мал**о**ваную*, *мал**о**ваныхъ*, *мал**ю**ва-*

[7]Тут і далей прыклады на старабеларускай мове прыводзяцца з «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» (Мінск : Беларуская навука, 1982–2017. Т. 1–37).

*нымъ*, *намул**ю**емъ*, *мул**ю**ваны*, *мул**ю**ваныя*, *мул**ю**ваный*, *мул**ю**ванымъ*, *мал**ю**вана*, *мал**ю**ваныя*, *измал**ю**вала*, *мул**ю**ваная* (*А ў тэй церкоўцѣ прастолы стояць, / Прастолы стояць **маляванные*** (БНПШ, с. 94)). Як сведчаць прыведзеныя прыклады, гэта слова вылучаецца высокай дэрывацыйнай актыўнасцю.

3. Пераход гукаў [о] і [а] у гукі [ы] і [у]. *Дзяк**а**ваць* (пол. *dzięk**o**wać* < сяр.-в.-ням. *dank**e**n*); старабеларускія формы: *дяк**у**емъ* (1486), *дак**оу**юче* (канец XV ст.), *дак**у**еть* (1516–1519), *дак**о**вати* (1562, 1598, 1637), *дак**у**ите* (каля 1580 г.), *дак**о́**ю* (1588, 1627, 1653), *дак**о́**ючы* (1616), *дак**о́**ючи* (1653), *дак**о**вавъ* (1722). У фальклорных запісах XIX ст. пераважае традыцыйнае напісанне, аднак месцамі назіраецца пераход [о] у гук [у]: *дзеньк**у**ваць*; *дзяк**о**ваць*, *дяк**о**вали*, *диньк**о**вавъ*, *подиньк**о**вавъ*, *дзяк**о**ваный* (*Кинулиси бояры подымаць, а ёнъ имъ **дзенькуваць**: дзенькуй вамъ, подружки* (БСР, с. 336)).

*К**а**штаваць* (пол. *k**o**sztować* < сяр.-в.-ням. *k**o**sten*); старабеларускія формы: *к**о**штовати* (каля 1580 г.; 1627, 1637; другая палова XVII ст.), *к**о**штовалъ* (каля 1580 г.), *к**о**штоуючи* (1598), *к**о**штовал* (пачатак XVII ст., сярэдзіна XVII ст.), *к**о**штовали* (пачатак XVII ст.), *к**о**штóючи* (пачатак XVII ст.), *к**о**штóеть* (1627), *к**о**штóю* (1653), *к**о**штоват* (другая палова XVII ст.). У фальклорных матэрыялах XIX ст. ужывалася форма *ск**у**штовавши* (*Горевавши, горевавши, да й умирай, не **скуштовавши*** (СБП, с. 27)).

*Кр**у**хмал* (пол. *kr**o**chtmal* < ням. *Kr**a**ftmehl*); у старабеларускіх тэкстах сустракаецца напісанне *кр**а**хмалъ* (1713). У запісах XIX ст. зафіксаваны наступныя формы: *отъ кр**у**хмалу*, *кр**у**хмалемъ* (*Накрухмалено **крухмалемъ**, капъ яно стояло колясомъ подъ сужаньковымъ поясомъ* (БСР, с. 339)).

*М**а**рдаваць* (ст.-пол. *m**o**rdować* < сяр.-в.-ням. *m**o**rt*); старабеларуская форма: *м**о**рдовалъ* (1617). У дыялектных гаворках у розных раёнах гэта слова змяніла сваё гучанне, што адлюстравалася ў некаторых фальклорных запісах XIX ст.: *м**у**рдуя*, *м**у**рдуй*; *зам**о**рдую*, *взм**о**рдоваўся* (*Хоць **мурдуй**, не **мурдуй**, будзець табѣ Наталька выдадзена, за праву ручаньку вывядзена* (БСР, с. 328)).

*М**а**ршалак* (ст.-пол. *m**a**rszałek* < с.-в.-ням. *m**a**rschalc*); старабеларускія формы: *м**а**ршалка* (канец XVI – пачатак XVII ст.), *м**а**ршалок* (1653), *м**а**ршалка* (1697). У фальклорных запісах XIX ст. сустракаецца форма *м**ы**ршалки*, аднак пераважаюць напісанні праз *а*: *м**а**ршалокъ*, *съ м**а**ршалкомъ*, *м**а**ршалочки*, *м**а**ршалочекъ*, *м**а**ршалыкъ*, *со м**а**ршалкамы* (*Свацьцюнька не сястрица, **мыршалки** не брахнейки, подрушнички не дзядзеньки* (БСР, с. 329)).

*Рат**а**ваць* (пол. *rat**o**wać* < ням. *rett**e**n*); старабеларуская форма: *рат**о**вали* (1615). У некаторых выпадках ужывання гэтага германізма ў фальклорных запісах XIX ст. адбываецца змена ў напісанні слова: *рат**у**ваци*, *рат**у**вала*, *рат**у**ваты*, *рет**о**ваць*, *рат**о**вати*, *рат**о**вала*, *отрат**о**вавъ*, *рат**о**вала*, *рат**о**ваты*, *рет**о**ваный*; але *рет**о**вали* (*Ой рада бъ я **ратуваты**, / Кобъ мні човенъ и весельце* (ПЭС, с. 82)).

*Рах**а**ваць* (пол. *rach**o**wać* < сяр.-в.-ням. *rech**e**n*); старабеларускія формы: *рахует* (пачатак XVII ст.), *рахую* (1653). У XIX ст. зафіксавана напісанне *рах**у**вализи*, аднак ужываліся і варыянты *рах**о**вализя*, *рох**о**ваўса* (*А ў тэй церкви ўси празьнички, уси святочки рядовализи, **рахувализи*** (БСР, с. 426)).

Дадзены фанетычны працэс таксама назіраецца і ў апісаных вышэй германізмах.

Сярод старабеларускіх форм слова *вандр**а**ваць* такі пераход не прадстаўлены, аднак у фальклорных тэкстах XIX ст. зафіксаваны наступныя формы: *мандр**у**ваты*, *помандр**у**вала* (*Ой, тыхій Дунаю, яжъ тебе не знала, / Да теперъ за Ясемъ да **помандрувала*** (ППДЗ, с. 130)).

Лексема *ган**а**к* у фальклорна-дыялектных матэрыялах XIX ст. мела варыянты напісання *ган**ы**чакъ*, *на ган**ы**чку*, *на ган**ы**къ* (*Ай выйдзи молойчикъ на **ганычакъ**, послухай, молойчикъ, приданычакъ* (БСР, с. 326)).

У фальклорных матэрыялах XIX ст. таксама сустракаюцца напісанні *ж**у**броваць*, *наж**у**бруюся*, *ж**ы**броваць* (*Ай прїѣдзь, брацецъ, у мою буду – хуць жа я молода **жуброваць** буду* (БСР, с. 359)); *ж**у**вняры*, *ж**у**вняровъ*, *ж**у**внярью* (*Дзеяры – **жувняры** – сусѣдзи мое, золовки – чачотки – госци мое, госци мое* (БСР-2, с. 345)); *м**ы**ливанинькій*, *м**у**леваная*, *м**у**леваные*, *м**у**ляваная*, *м**у**ляровъ*, *нам**у**люемъ*, *зм**у**лявавши*, *м**у**люваная*, *м**у**лёване*, *м**у**люя*, *м**у**люваны*, *м**у**люваныя*, *м**у**люваный*, *м**у**леваняныкій*, *м**у**люванымъ* (*Съ ноченкыми шовковыми / Коромысилъ **мыливанинькій*** (БНПШ, с. 76); *На синемъ мори лоточка плыве, рисованая, **муляваная*** (БСР, с. 34); *Зъ нами, дзѣвка, зъ нами, въ мулюваныя сани: сани наши **мулюваныя**, кони наши гудуваные* (БСР, с. 322); *Исписала, **измалювала** / На білы бумазѣ славны* (ПЭС, с. 144)); *р**ы**нькъ*, *р**ы**нычикъ* (*Приѣхаўши на **рынькъ**, / Пытается ў гыспыдахъ* (БНПШ, с. 146)); *шан**у**ваць* (*Якъ я маю цѣловаць, / Ня умѣла сястра **шануваць*** (БНПШ, с. 343)).

**Фанетычная адаптацыя зычных.** Шэраг фанетычных змен адбыўся і ў сістэме кансанантызму германізмаў падчас іх адаптацыі ў дыялектнай мове. Разгледзім некаторыя з іх.

1. Перадача нямецкага гука [ф] праз [п], [ф], [хв]. *Ву**х**наль* (пол. *hu**f**nal* < ням. *Hu**f**nagel*); старабеларускія формы: *за у**х**нали* (1688), *у**ф**налевъ* (1689), *у**ф**наловъ* (1690), *у**х**наловъ* (1691), *у**х**налей* (1699). У фальклорных матэрыялах XIX ст. зафіксавана напісанне *ву**х**нали* (*Есць у мене тацянкины крали, / Будуць къ подковкамъ **вухнали*** (БП, с. 222)).

*Гра**ф*** (пол. *gra**f*** < ням. *Gra**f***); старабеларускія формы: *гра**б**ею* (1508), *кгра**б**е* (1567), *гра**б**ство* (1582), *гра**б**и* (1582; пачатак XVII ст.), *кгра**б**и* (1597; пачатак XVII ст.), *кгра**б**я* (1628), *гра**б**я* (1663). У XIX ст.

форма слова працягвала адаптавацца, аднак захоўваўся і варыянт з гукам [ф]: *грапъ*, *графъ* (***Грапъ*** *Пашкевичъ разговаривавъ: не журитеся, ребятушки, бѣлаго цара солдатушки* (БСР, с. 68)).

***Пляшка*** (ст.-пол. ***F**lasza* < сяр.-в.-ням. ***v**lasche*); старабеларускія формы: *полу**ф**ляшковъ* (1555–1556), ***ф**ляшъ* (1555–1556, 1598, 1616, 1699), ***ф**ляшу* (каля 1580 г.), ***п**ляш* (1582), *пол**п**ляшъковъ* (1582), ***ф**аляша* (1626), *до **ф**лаши* (1627), ***ф**ляше* (1710). У запісах XIX ст. зафіксаваны формы з гукам [п]: ***п**ляшка*, ***п**ляшачку*, *съ **п**ляшкою*, ***п**ляшки* (*До иншои ходыть, / По чотыры* ***пляшки*** *горелицы носыть* (ППДЗ, с. 103)).

*Тра**п**іць* (ст.-пол. *tre**f**ić* < сяр.-в.-ням. *tre**ff**en*); старабеларускія формы: *тра**ф**ил* (канец XV ст.; каля 1580 г.; пачатак XVII ст.), *тра**ф**или* (1598; пачатак XVII ст.), *тра**хв**илъ* (1598), *тра**ф**ившы* (1618), *тра**ф**ивши* (1627), *тра**п**илъ* (1627), *тра**п**иш* (пачатак XVII ст.), *тра**ф**лю* (1637), *тра**ф**илъ* (1697). У фальклорных матэрыялах XIX ст. гэта слова і яго дэрываты паслядоўна перадаюцца праз [п]: *тра**п**ляюцца*, *утра**п**енню*, *тра**п**лю* (*Муха и съ пчалою упоила цаплю, бѣдна жъ моя головонька – до дому не* ***траплю*** (БСР, с. 214)).

***Ф**алда* (пол. ***f**ałd* < сяр.-в.-ням. ***v**alde*); старабеларуская форма: ***ф**алды* (1653). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. сустракаюцца напісанні ***хв**аўды*, ***хв**анды* (*А на туй сукни друбные* ***хванды****, / Люблять ее ненарыкомъ – запраўды* (ППДЗ, с. 49)).

***Ф**артух* (пол. ***f**artuch* < сяр.-в.-ням. ***v**ortuoch*); старабеларускія формы: ***ф**артухъ* (1540, 1556–1557, 1681, 1685, 1688), ***ф**артуховъ* (1625), *безъ **ф**артуха* (1640), ***ф**артóх* (1653), ***хв**артуховъ* (1663), *на **ф**артуки* (1695). У XIX ст. тэндэнцыя замены [ф] на [хв] працягваецца: ***хв**артушокъ*, ***хв**артушиночку*, ***хв**артунонька*, ***хв**артукомъ*, ***хв**артухъ*, ***хв**артукъ*, ***хв**артуха*; аднак фіксуюцца таксама напісанні ***ф**артушокъ*, ***ф**артушки* (*Сховала чарочку подъ* ***хвартухъ****, / На свайго милаго миргала* (БНПШ, с. 129)).

***Ф**арэйтар* (< ням. ***V**orreiter*); старабеларуская форма: ***ф**оритаръ* (1653). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. знаходзім напісанне ***хв**алеторъ* (*Веробей – кучаръ, соловей –* ***хвалеторъ****, сычикъ – гобурнаторъ* (БСР, с. 201)).

***Ф**урман* (пол. ***f**urman* < ням. ***F**uhrmann*); старабеларускія формы: ***ф**урманомъ* (1500, 1540, 1597, 1711), ***х**óрмономъ* (1516), *у **х**урманевъ* (1558), *черезъ **ф**урмана* (1583), ***ф**уръмани* (1593), ***ф**орманомъ* (1620), ***ф**орман* (1653), ***ф**урмановъ* (1679), ***х**урману* (1686), ***х**урманови* (1692). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. паралельна ўжываюцца формы ***х**урманку*, ***х**урманство*, ***х**урманъ*, *за **х**урманчика*, ***х**урманчики* і ***ф**урманушку*, ***ф**урманы*, ***ф**урманеньку*, ***ф**урманъ* (*Рыечка рые, скача: беражись рыечка, –* ***хурманъ*** *догоняе* (БСР, с. 302)).

*Што**ф*** (< нова.-в.-ням. *Stau**f***); старабеларуская форма: *што**ф**ы* (1587). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. фіксуюцца напісанні *полушто**п**ъ*, *полушто**х**ъ*, *полушто**к**ъ* (*Вынимала красная дѣвочка водки* ***полуштопъ*** *– / Вынимала сы карманчика сладкой водочки, водки полуштохъ* (БСР, с. 131)).

2. Пераход нямецкага [х] у гукі [к] ці [г]. *Шля**х*** (пол. *szla**ch*** < чэш. *šla**k*** < сяр.-в.-ням. *sla**g***); старабеларускія формы: *на шляхо**х**ъ* (1585), *на шля**х**у* (пачатак XVII ст.), *шля**х**ъ* (1593). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. адзначаюцца розныя напісанні: *шля**к**амы*, *шля**г**амы* і *шля**х**и*, *шля**х**у*, *шля**х**ъ*, *шля**х**омъ* (*Да вэзытэ пяниченьку* ***шлякамы****, / Щобъ занэсло чорны очи пескамы* (ПЭС, с. 130); *Тэмными лѣсамы, / Битыми* ***шлягамы*** (ПЭС, с. 132)).

Як і ў старабеларускай мове, у XIX ст. назіралася варыянтнасць пры напісанні слова *фарту**х***: *хварту**к**ъ*, *хварту**к**омъ* і *хварту**х**ъ*, *хварту**х**а* (*Кабъ цябе кадукъ порваў, / Якъ ты мой* ***хвартукъ*** *подраў* (БНПШ, с. 271)).

3. Адлюстраванне зацвярдзелага [р]. ***Р**умка* (< ням. ***R**ömer*); у старабеларускай мове слова не зафіксавана. У XIX ст. ужывалася форма з цвёрдым [р] (*Одну* ***румку*** *за цябе, / А другую за сябе* (БНПШ, с. 282)).

***Р**эшта* (ст.-пол. ***r**eszta* < ням. ***R**est*); старабеларуская форма: ***р**ешта* (1691). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. зацвярдзелы [р] передаваўся непаслядоўна: ***р**эшто*, ***р**ешту*, ***р**ешты* (*Што за што, а* ***рэшто*** *въ ноги* (СБП, с. 188)).

*Тале**р**ка* (< ням. *Teller*); старабеларускія формы: *тале**ро**къ* (1540, 1588, 1690), *та**ре**лок* (1578, 1579, 1656), *та**ре**локъ* (1593), *толе**ро**к* (1596), *тале**ре**къ* (1598), *тале**р**ки* (пачатак XVII ст.; 1688), *теле**ро**къ* (1626). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. назіраецца варыянтнасць у напісанні гэтага слова: *на та**р**элцы*, *на та**р**элку*, але *та**ре**лкою*, *на та**ре**лку*, *съ та**ре**лки*, *та**ре**лка*, *та**ре**лкой*, *на тале**ре**чки*, *на тале**ро**нци*, *на та**ре**лочкахъ*, *на тале**ро**нцы*, *на та**ре**лочкѣ*, *тале**р**ки*, *на та**ре**ўки*, *на та**ре**лоццы*, *на та**ри**лочку*, *на та**ре**лцѣ*, *на та**р**ѣлку*, *на тале**рцѣ***, *за та**ре**лочку* (*Дамъ по чарцы горѣлки, а хозяйка сыръ на* ***тарэлцы*** (БСР, с. 416)).

4. Змякчэнне нямецкага гука [л] да беларускага [л’]. *Ганда**ль*** (пол. *hande**l*** < ням. *Hande**l***); старабеларускія формы: *ганд**ле**въ* (1565), *ганд**лю**ють* (1566), *кганд**ле**вать* (1582), *ганде**ль*** (1588, 1623), *ганд**ле**вать* (1591), *ганд**ле**вати* (1591, 1621), *до ганд**лю*** (1627), *ганд**лю**ючи* (1645), *ганд**лі**омъ* (1722), *ганд**ле**вали* (1722). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. зафіксавана напісанне *ганд**ли**ваць* (*Самъ поѣхаў на мора / Ў кораблёхъ* ***гандливаць*** (БНПШ, с. 259)).

*Гэбе**ль*** (пол. *hebe**l*** < ням. *Hobe**l***); старабеларускія формы: *геб**ли*** (1588), *геб**л**ем* (пачатак XVII ст.). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. паслядоўна перадаецца мяккі [л’]: *геб**ля**, геб**ле**мъ* (*Ци **геблемъ**, ци скоблею, все ровно* (СБП, с. 179)).

*Ды**ль*** (пол. *dy**l*** < ням. *Die**le***); старабеларускія формы: *з ды**л**ев* (пачатак XVII ст.), *ды**лъ*** (1617), *ды**л*** (1653). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. фіксуецца форма з мяккім [л’]: *по ды**лю***, *ды**ль*** (*Попівна хороша / По **дылю** скакала* (ПЭС, с. 149)).

*К**лё**цка* (пол. *k**lo**sek* < сяр.-в.-ням. *k**lô**z*); старабеларуская форма: *к**ле**цъ* (1653). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. фіксуюцца формы *к**ле**цаньки*, *к**лё**цки*, *к**ле**цки*, *по к**лё**цкахъ* (*Спасибо за **клёцки**, поливка въ зубы навязла* (СБП, с. 154)).

*К**ля**ма* (ст.-пол. *k**la**ma* < с.-в.-ням *k**la**m*); старабеларускія формы: *зъ к**ля**мкою* (1571), *к**ля**мка* (1586, 1592), *к**лѧ**мка* (1653), *за к**ля**мку* (1681, 1710), *к**ля**мъки* (1697). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. зафіксавана напісанне *к**ля**мка* (*Запала **клямка*** (СБП, с. 46)).

*Ку**ля*** (пол. *ku**la*** < сяр.-в.-ням. *ku**le***); старабеларускія формы: *ку**ле*** (1517), *ку**ля*** (1552, 1578), с *ку**ле**ю* (1566), *дл**ѧ** ку**ль*** (каля 1580 г., 1604), *ку**лю*** (1684). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. слова фіксуецца толькі з мяккім [л’]: *ку**ли**, ку**ля*** (*Оженыла его **куля** быстрая, / Удружила его шабля острая* (ПЭС, с. 138)).

***Лё**х* (ст.-пол. ***lo**ch* < сяр.-в.-ням. ***lo**ch*); старабеларускія формы: ***ле**хи* (1539), ***ле**хъ* (1552, 1571), ***ле**ха* (1582). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. ужыта форма ***лё**шки* (*Посѣю я три **лёшки** цыбули, / Кабъ мои осуднички судзили да поснули* (БНПШ, с. 194)).

*Пыта**ль*** (пол. *pyte**l*** < чэш. *pyte**l*** < ст.-в.-ням. *būti**l***), старабеларуская форма: *пыт**ло**ванои* (1653). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. зафіксавана напісанне *пыт**ля**ваныя* (*За яго хлябы **пытляваныя**, / За яго лыжки посрибряныя* (БПБ, с. 2)).

*Ста**ль*** (пол. *sta**l*** < нова-в.-ням. *Stah**l***); старабеларускія формы: *ста**ль*** (пачатак XVI ст.; 1685, 1686, 1692), *ста**л*** (1579), *ста**ли*** (1583, 1684), *ста**лю*** (1682). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. паслядоўна перадаваўся мяккі [л’]: *ста**ль***, *со ста**ли***, *ста**ле**нные*, *ста**лё**нъ*, *ста**ли**стыя*, *ста**лё**выя*, *ста**лё**вую*, *ста**ля**ныя*, *ста**ля**ну*, *ста**ля**ной*, *ста**ле**ная*, *ста**ля**ными*, *ста**ле**вые*, *ста**ле**ныя*, *шта**ле**вые* (*Охъ дѣвочка, дѣвочка, сошій менѣ чахмянечакъ со голаньскій **стали*** (БСР, с. 165)).

*Хві**ля*** (пол. *chwi**la*** < ст.-в.-ням. *hwî**la***); старабеларускія формы: *хви**лю*** (пачатак XVII ст.), *хви**ли*** (XVII ст.). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. зафіксаваны формы *хви**ли***, *хви**ля*** (*Поднялася **хвиля** – бура, / Казакову гречку здула* (БСР, с. 193));

*Ш**ля**хта* (пол. *sz**la**chta* < сяр.-в.-ням. *s**la**hte*); старабеларуская форма: *ш**ля**хту* (1566). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. ужываліся формы *ш**ля**хта*, *ш**ля**хетскаго*, *ш**ля**хецки*, *ш**ля**хцицъ*, *ш**ля**хцюцьки* (*Маци шнуроўку купила, / Кабъ мяне **шляхта** любила* (БНПШ, с. 271)).

*Шэ**л**ег* (пол. *sze**la**g* < сяр.-в.-ням. *schi**ll**inc*); старабеларуская форма: *ше**ле**гами* (1598). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. фіксуюцца толькі формы з мяккім [л’]: *ше**ле**гъ*, *ше**ля**жокъ*, *ше**ля**жечки*, *ше**ле**жки*, *ше**ле**га*, *по ше**ля**гу* (*Богу – **шеляжокъ**, / А намъ – пирожокъ* (БНПШ, с. 49)).

Аналагічная фанетычная з’ява заўважаецца і ў напісанні германізмаў, якія разглядаліся вышэй: *вухна**ли*** (*Есць у мене тацянкины крали, / Будуць къ подковкамъ **вухнали*** (БП, с. 222)); *п**ля**шка*, *п**ля**шачку*, *съ п**ля**шкою*, *п**ля**шки* (*За **пляшачку** возьметца – горѣлычка льлетца, за чарычку возьметца – горѣлычка пъетца* (БСР, с. 274)); *ш**ля**камы*, *ш**ля**гамы*, *ш**ля**хи*, *ш**ля**ху*, *ш**ля**хъ*, *ш**ля**хомъ* (*Бытымъ **шляхомъ** солдаты идуть, / Мого дружка коне вэдуть* (ПЭС, с. 137)).

5. Дысіміляцыя. *Па**м**пушка* (пол. *pa**m**pich* < ням. *Pfa**nn**kuchen*); старабеларуская форма: *па**м**пѹшок* (1653). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. зафіксавана напісанне *па**н**пушки* (*И посцелю сцелиць, – водли мяне молодэя! Вячера – **панпушки**, посцеля подушки* (БСР, с. 269)).

*Яв**а**р* (< ст.-в.-ням. *a**h**orn*); старабеларуская форма: *яв**о**ръ* (1516–1519). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. адзначаюцца формы *ягоръ*, *ягоро*, *ягора*, *у ягорѣ*, *яуръ*, *яворъ*, *яворове*, *яворецъ*, *на яворѣ*, *на явори*, *зъ явору* (*Одчини матынька новы дворъ! / Вязу табѣ нявѣсту якъ **яворъ*** (БНПШ, с. 348); *Останови коничка подъ **ягорой**, / Ягоро дзеревцо счасливоя* (БНПШ, с. 472); *На сыну поросъ зяленый **яуръ**, на нявѣстуньки бѣлая бяроза* (БСР, с. 372)).

*Ярма**р**ка* (пол. *jarmar**k*** < сяр.-в.-ням. *jârmar**k**et*); старабеларуская форма: *ярмо**р**окъ* (1498). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. адзначаюцца напісанні *ярмолокъ*, *по ярмалку*, *на ярмалцы* (*А дѣдъ баби санки ладя, / На **ярмалку** выпровадя* (БСР, с. 228)).

Сярод апісаных вышэй слоў таксама выяўлены выпадкі дысіміляцыі: ***м**андровати*, *по**м**андрую*, ***м**андруваты*, ***м**андроваты*, *по**м**андрувала*, ***м**андрує*, ***м**андруючы* (*А личинко помалюю / И съ тобою **помандрую*** (ПЭС, с. 128)); *хвалеторъ*.

6. Азванчэнне пачатковага гука [х] да [г]. ***Г**артаваць* (пол. ***h**artować* < ням. ***h**ärten*); старабеларускія формы: *гартовала* (пачатак XVII ст.), *гартовати* (сярэдзіна XVII ст.). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. ужываецца форма *гартуюць* (*Яны куюць и **гартуюць**, / Чи штабы жалѣзы* (БНПШ, с. 379)).

***Гетман*** (пол. ***h****etman* < сяр.-ням. дыял. ***h****äuptmann*); старабеларускія формы: *гетманъ* (1507, 1516, 1578, 1653), *гетманомъ* (1534; XVII ст.; 1697), *гетмана* (1668), *гэтьмановъ* (1566), *гэтманове* (каля 1580 г.), ***h****etmana* (канец XVI – пачатак XVII ст.). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. паслядоўна перадаецца звонкае [г]: *при гетману*, *гатьманъ* (*А два служить при* ***гетману****, / А два служить нашему пану* (ПЭС, с. 94)).

***Гурт*** (пол. ***h****urt* < с.-в.-ням. ***h****urt*), старабеларуская форма: *гуртомъ* (1588, 1696, 1698). У фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. зафіксавана форма *гурты* (*Охъ вы уставайте, хлопцы гайдарочки, собирайте свое* ***гурты*** *– мы погонимъ воловъ у Москву* (БСР, с. 58)).

Выпадкі такога азванчэння назіраюцца і ў некаторых словах, якія разглядаліся вышэй: *гандливаць* (*Самъ поѣхаў на мора / Ў кораблёхъ* ***гандливаць*** (БНПШ, с. 259)); *гаплычки* (*Куплю жъ я ей черевычки –* ***гаплычки****, / Еще къ тому черевычки на ручки* (ППДЗ, с. 30)); *гебля*, *геблемъ* (*Послѣ гебля топоромъ* (СБП, с. 134)).

У фальклорна-дыялектных зборніках XIX ст. можна адзначыць і іншыя адметныя формы германізмаў. Так, у напісанні слова *сталь* у адным выпадку перадаваліся асаблівасці нямецкага вымаўлення: *Его сошнечки да* ***шталевые****, / Его полычки да яловыя* (ПЭС, с. 44). У вывучаемы перыяд таксама заўважаецца неаднастайнасць у адлюстраванні на пісьме гукаў [дз] (***Дякуй*** *Богу,* ***дякуй*** *Богу и нашому цару, / Що выгнаў вонъ тую паньщину изъ нашего краю* (ППДЗ, с. 133); *Да* ***дзякуй****,* ***дзякуй*** *Бѣлый Царь, / Да* ***дзякуй****, дзякуй за красную панну* (БНПШ, с. 104)), [ў] (*Сѣў на коня, якъ* ***жоўнеръ****, / Ўзяў Сцяпутку за коўнеръ* (БНПШ, с. 472); *Хоць* ***жовнерамъ*** *дали плату / Штобъ брехали тамъ Пилату* (БП, с. 86); *На ей сукня въ друбненькіе* ***хваўды****, / Да любили ее не нарокомъ, по правды* (БПБ, с. 26); *Да на ихъ сукни – дрыбненькія* ***хванды****, / Да любять ихъ да хорошіе паны* (ППДЗ, с. 52)), [ц] (*Ой рада бъ я* ***ратовати****, да не умѣю усплывати; коли бъ лоточка, весельцо – ратовала бъ моё серца* (БСР, с. 12); *А рада бъ я* ***ратуваци****, ды ня ўмѣю я* ***плываци*** (БСР, с. 392); *Буду рыбку варици, буду шумоваци, / Буду мужа любици, буду* ***шановаци*** (БП, с. 101); *Буде мене мой родъ* ***шановати****, я буду по повной выпивати* (БСР, с. 25)).

Германізмы ў народных гаворках падпалі пад мадыфікацыі і на акцэнталагічным узроўні [11, с. 61]. У нямецкай мове ў большасці выпадкаў націск падае на першы склад у слове, у той час як у беларускай мове націск не мае пастаяннага месца. Падчас адаптацыі некаторыя германізмы захавалі націск, уласцівы нямецкай мове (*гáндаль* < *Hándel*, *гэбель* < *ням. Hóbel*), іншыя яго змянілі (*гаплíк* < *Héftel*, *жаўнéр* < *S'öldner*, *ліхтáр* < *Léuchter*).

## Заключэнне

Паміж сучаснай беларускай літаратурнай мовай і старабеларускай пісьмовай мовай, як вядома, няма прамой сувязі і пераемнасці па той прычыне, што старая пісьмовая мова выйшла з ужытку ў канцы XVII ст., а новая літаратурная мова складвалася ў XIX ст. на базе жывых народных гаворак [5, с. 120].

Пры аналізе германізмаў у старабеларускай пісьменнасці і народных гаворках часта прыходзіцца назіраць, што зафіксаваныя ў помніках паасобныя формы германізмаў указваюць на магчымасць існавання такой формы, якая пакуль што не выяўлена, але павінна з'яўляцца неабходнай, асноўнай часткай, звяном у ланцугу форм адной сям'і, аднаго семантычнага гнязда [6, с. 84]. Дапамогай пры высвятленні формы такой нявыяўленай у старабеларускай мове лексемы можа стаць аналіз выкарыстання і адаптацыі гэтага германізма ў фальклорна-дыялектных запісах XIX ст.

Такім чынам, германізмы займаюць значную частку ў складзе лексікі фальклорна-дыялектных запісаў XIX ст. Аналіз фактычнага матэрыялу дазволіў выявіць асаблівасці фанетычнай адаптацыі слоў нямецкага паходжання ў галіне вакалізму (аканне, яканне, пераход гукаў [о] і [а] у гукі [ы] і [у]) і кансанантызму (пераход нямецкага гука [ф] у гукі [п], [хв]; пераход нямецкага гука [х] у беларускія [к] ці [г]; перадача зацвярдзелага [р] на пісьме; перадача нямецкага [л] мяккім гукам [л']; дысіміляцыя; азванчэнне пачатковага нямецкага гука [х] да беларускага [г]). Пры супастаўленні германізмаў у старабеларускай мове і фальклорна-дыялектных запісах XIX ст. выяўляецца фанетычная варыянтнасць форм слова ў розныя адрэзкі часу і ў межах аднаго перыяду, што тлумачыцца перш за ўсё далейшым засваеннем германізмаў у беларускай мове.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Станкевіч АА. Лексіка іншамоўнага паходжання ў беларускіх народных гаворках. У: Прыгодзіч МР, рэдактар. *Беларускае слова: дыялектнае і запазычанае. Зборнік артыкулаў па матэрыялах навуковых чытанняў, прысвечанных памяці дацэнта Еўдакіі Сцяпанаўны Мяцельскай; 26–27 красавіка 2011 г.; Мінск, Беларусь.* Мінск: Права і эканоміка; 2011. с. 149–158.

2. Бубновіч ІІ. *Засваенне іншамоўных слоў беларускаю літаратурнаю моваю.* Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы; 2000.

3. Прыгодзіч АА. З гісторыі графіка-арфаграфічнага афармлення іншамоўнай лексікі. У: Прыгодзіч МР, рэдактар. *Беларуская арфаграфія: здабыткі і перспектывы. Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю БДУ; 20–21 кастрычніка 2011 г.; Мінск, Беларусь*. Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ; 2011. с. 75–77.

4. Масленікава СС. *Германізмы ў дыялектнай мове Гродзеншчыны*. Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы; 2013.

5. Жураўскі АІ. Запазычаная лексіка ў старабеларускай мове. У: Баханькоў АЯ, Жураўскі АІ, Суднік МР, рэдактары. *Гістарычная лексікалогія беларускай мовы*. Мінск: Навука і тэхніка; 1970. с. 81–160.

6. Чартко ІІ. Германізмы народнай беларускай мовы і іх адпаведнікі ў нямецкай мове. У: Прыгодзіч АА, Прыгодзіч МР, Генчэль Г, укладальнікі. *Германізмы ў беларускай мове.* Прыгодзіч МР, рэдактар. Мінск: БДУ; 2015. с. 79–85.

## References

1. Stankevich AA. [Lexis of foreign origin in Belarusian folk]. In: Prygodzich MR, editor. *Belaruskae slova: dyjalektnae i zapazychanae. Zbornik artykulaw pa matjeryjalah navukovyh chytannjaw, prysvechannyh pamjaci dacjenta Ewdakii Scjapanawny Mjacel'skaj; 26–27 krasavika 2011 g.; Minsk, Belarus'* [Belarusian word: dialectal and borrowed. Collection of articles based on scientific readings in memory of docent Ewdakija Scjapanawna Mjacel'skaja; 2011 April 26–27; Minsk, Belarus]. Minsk: Prava i jekanomika; 2011. p. 149–158. Belarusian.

2. Bubnovich II. *Zasvaenne inshamownyh slow belaruskaju litaraturnaju movaju* [Assimilation of foreign words by Belarusian literary language]. Hrodna: Janka Kupala HrSU; 2000. Belarusian.

3. Prygodzich AA. [From the history of graphic and orthographic realization of foreign vocabulary]. In: Prygodzich MR, editor. *Belaruskaja arfagrafija: zdabytki i perspektyvy. Matjeryjaly rjespublikanskaj navukova-praktychnaj kanferjencyi, prysvechanaj 90-goddzju BDU; 20–21 kastrychnika 2011; Minsk, Belarus'* [Belarusian spelling: achievements and prospects: materials of republican scientific-practical conference dedicated to the 90$^{th}$ anniversary of BSU; 2011 October 20–21; Minsk, Belarus]. Minsk: Publishing House of BSU; 2011. p. 75–77. Belarusian.

4. Maslenikava SS. *Germanizmy w dyjalektnaj move Grodzenshchyny* [Germanisms in the dialect language of Grogno region]. Hrodna: Janka Kupala HrSU; 2013. Belarusian.

5. Zhurawski AI. [Borrowed words in Old Belarusian]. In: Bahan'kow AJ, Zhurawski AI, Sudnik MR, editors. *Gistarychnaja leksikalogija belaruskaj movy* [Historical lexicology of the Belarusian language]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1970. p. 81–160. Belarusian.

6. Chartko II. [Germanisms of the folk Belarusian language and their equivalents in German]. In: Prygodzich AA, Prygodzich MR, Genchjel' G, compilers. *Germanizmy w belaruskaj move* [Germanisms in the Belarusian language]. Prygodzich MR, editor. Minsk: Belarusian State University; 2015. p. 79–85. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 20.04.2018.*
*Received by editorial board 20.04.2018.*